ББК 63.3 (2Б)
Г 516

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

*Рэцэнзенты:* загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт П.І. Брыгадзін; загадчык кафедры гісторыі Беларусі Беларускага лінгвістычнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт С.Я. Новікаў.

*Пад агульнай рэдакцыяй* прафесара В. М. Фаміна,
дацэнта У. В. Тугая

Дапаможнік уключае ў сябе артыкулы па найбольш актуальных праблемах гісторыі Беларусі. Яго асаблівасцю з'яўляецца навуковы падыход да асвятлення разглядаемых пытанняў, імкненне выйсці за межы панаваўшых догмаў.

Прызначаецца студэнтам гістарычных факультэтаў вышэйшых педагагічных навучальных устаноў.

ISBN 985-60-87-56-2

© Калектыў аўтараў, 1994.
© *Арыгінал-макет:* А.А. Пакала, 1994.

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Вучэбны дапаможнік
## для студэнтаў гістарычных факультэтаў

*Мінск 1994*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Вучэбнае выданне*

# Гісторыя Беларусі

*Вучэбны дапаможнік*
*для студэнтаў гістарычных факультэтаў*

*Карэктар* А. В. Сідарэнка

Падпісана ў друк 13.12.94. Фармат 60x84 1/16. Папера друк № 2.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,5. Ум. фарб.-адб. 8,00. Ул.-выд. арк. 6,7
Тыраж 200 экз. Заказ 1053. Цана 4500 р.

Ратапрынт БДПУ. 220809. г. Мінск, вул. Савецкая, 18.

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА ........ 3
БАЛТЫ І СЛАВЯНЕ НА БЕЛАРУСІ (*С. А. Адамовіч, В. І. Шадыра*) ........ 4
ПРАБЛЕМА ЎТВАРЭННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. КАНЕЦ XIII — ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIV СТ. (*А. Ф. Рацько*) ........ 8
НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ, КУЛЬТУРЫ І НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII — XIX СТ. (*С. А. Адамовіч*) ........ 16
УДЗЕЛ ТАТАРАЎ-МУСУЛЬМАН У ПАЎСТАННІ 1794 ГОДА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ (*І. Б. Канапацкі*) ........ 23
ХТО ПЕРАМОГ НА Р. БЯРЭЗІНЕ Ў ЛІСТАПАДЗЕ 1812 ГОДА? (*І. А. Груца*) ........ 29
НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ДВАРАНСКАГА ЗЕМЛЕЎЛАДАННЯ НА БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX — ПАЧАТАК XX СТАГОДДЗЯ) (*А. П. Жытко*) ........ 36
АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ І ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ДЛЯ ЧЫГУНАК БЕЛАРУСІ Ў 1900-1913 ГГ. (*П. А. Тупік*) ........ 44
БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (*М. В. Цуба*) ........ 53
АСВЯТЛЕННЕ АБАРОНЫ БЕЛАРУСКІХ ТЭРЫТОРЫЙ АД ПОЛЬСКІХ ВОЙСК У 1919 Г. У ДРУКУ БЕЛАРУСІ І ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ (*У. У. Куніцкі*) ........ 62
ДА ПЫТАННЯ АБ УТВАРЭННІ І ДЗЕЙНАСЦІ МІНСКАГА КАМІТЭТА АБ'ЯДНАНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП (САКАВІК — ЛІПЕНЬ 1917 Г.) (*М. Я. Сяменчык*) ........ 67
ПАЛІТЫЧНЫЯ РЭПРЭСІІ НА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 20-Х — 30-Я ГАДЫ (*М. К. Сакалоў*) ........ 78
БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ Ў ГАЛІНЕ НАРКАМАСВЕТЫ Ў 20-Я ГАДЫ (*У. В. Тугай, В. Ц. Ісаеў*) ........ 87
ПОЛЬСКІЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ САВЕТЫ НА БЕЛАРУСІ (20-30-Я ГГ. XX СТ.) (*У. В. Тугай, В. М. Фамін*) ........ 92
ФАРМІРАВАННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ АРМІІ КРАЁВАЙ АКРУГІ "НАВАГРУДАК" (*С. П. Варадзін*) ........ 96
ПРАФСАЮЗЫ БЕЛАРУСІ Ў СІСТЭМЕ САВЕЦКАГА ТАТАЛІТАРЫЗМУ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945-1985) (*Ф. А. Шумскі*) ........ 107



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

людскімі целамі былі нагрувашчаны кучы бязладна раскіданых рэчаў, трупы коней, сабак, катоў, свіней, бо раз`юшаныя відам крыві рускія салдаты не выпускалі жывымі нават жывёл. Запаленая ядрамі і казацкімі паходнямі Прага стаяла ў полымі і дыме, дахі развальваліся з трэскам. Усё гэта суправаджалася прарэзлівымі крыкамі пераможцаў"[1].

Салдаты з татарскіх палкоў Авангарднай аховы падзялілі лёс іншых абаронцаў Прагі. Страты абаронцаў былі велізарныя. Невядомы мусульманін, якому пашанцавала застацца жывым, запісаў на палях свайго Хамаіла (малітоўніка), што "на шанцах Прагі загінула шмат мусульман, адных толькі афіцэраў некалькі дзесяткаў".

Праз год, калі рускія ўлады правялі перапіс насельніцтва на захопленых землях, у многіх татарскіх ваколіцах Віленскага і Трокскага ваяводстваў часта трапляліся імёны ўжо з прыпіскай: "А муж яе пад Прагай загінуў". Побач значыліся ветэраны, якія служылі ў войску літоўскім або каронным — хто 5, хто 10, а хто і болей гадоў, — з паметай: "Служыў да Прагі", г.зн. да самага канца, да апошніх мінут паўстання, да той пары, пакуль існавала яшчэ дзяржава "абодвух народаў".

Але не ўсе татарскія воіны загінулі, многім пашчасціла выратавацца ад расійскай няволі. Так група падначаленых Эліша Сабалеўскага выратавалася і зберагла нават сцяг свайго палка. Гэты сцяг некаторы час вісеў у мячэці ў Студзянцы, роднай вёсцы Якуба Азулевіча (штандар загінуў у час першай сусветнай вайны). Частка салдат татарскіх палкоў эмігрыравала ў Турцыю. У 1796 годзе, паводле звестак П.Бараўскага, у Філіпоўцах, у турэцкай Валахіі, сярод польскіх эмігрантаў знаходзілася значная група беларускіх мусульман. Тут былі падпалкоўнік С. Карыцкі, ротмістры Самуэль Сабалеўскі, Якуб Бараноўскі, Аляксандр Мелех, амаль 20 паручнікаў, падпаручнікаў і харунжых, некалькі дзесяткаў салдат з даўніх палкоў Авангарднай аховы. Мусульманскія эмігранты найчасцей ішлі на службу ў султанскую армію або станавіліся асаднікамі на тэрыторыі Валахіі і Дабруджы. Многія з іх былі звязаны з польскай эміграцыяй, вялі работу на карысць сваёй Радзімы як эмісары, кур`еры, альбо ваюючы са зброяй у руках з акупантамі на Каўказе, у Італіі і Францыі. Адзін з такіх эмісараў М. Ахматовіч у 20-х гадах XIX ст. аб`язджаў польскія двары на Украіне і заклікаў да паўстання супраць захопнікаў. Пад час нелегальных сходак змоўшчыкаў ён часта з напеўным беларускім акцэнтам усхвалявана казаў: "У сталіцы Зыгмунта тлее падземны агонь, кіпіць лава і неўзабаве яна разальецца па ўсіх польскіх і літоўскіх землях. Так хоча Аллах, інакш быць не можа. Паўстань, люд Божы"[2].

Мужнасць беларускіх татар-мусульман і пралітая кроў у абароне

[1] H. Mesiicki. Dzieje porozbiorowe Litwy i Rusi. Wilno.1911.s.193-194.

[2] P. Borawski. Указ. твор. С. 245-246.



Рэчы Паспалітай былі прычынай да таго, што польска-літоўскае грамадства прызнала іх за сваіх, за паўнапраўных і паўнавартасных грамадзян. Ян Дуклян Ахоцкі ў сваіх мемуарах, успамінаючы пра розныя этнічныя роды Оўруцкай зямлі, так пісаў пра беларускіх мусульман: "...ёсць татары перакопскія, кыпчакі, што былі на службе Рэчы Паспалітай, некаторыя засталіся ў Оўруцкай зямлі, прынялі хрысціянскую веру, а большасць у Літве трымаюцца пры сваёй даўняй веры, маюць мячэці і мулаў. З такой вось сям`і і быў той слаўны генерал Беляк[1] і нямала вышэйшых афіцэраў: Ахматовічы, Азулевічы і г.д., якія да скону свайго жыцця верна служылі абранай Радзіме ... Трэба аддаць належнае ўсім сем`ям без выключэння ... натуралізаваная ў краіне новая шляхта палюбіла новую Айчыну і верна ёй служыла".

***Літаратура:***

1. *А. Энгель.* Описание дел, хранящихся в архиве Виленского генерал-губернаторства. Т.1,ч.1. Вилна. 1868. С.927-929; Т.2,ч.1, С.53,54, 103.

## ХТО ПЕРАМОГ НА Р. БЯРЭЗІНЕ Ў ЛІСТАПАДЗЕ 1812 ГОДА ?

І. А. Груца

У мінулым нашай Айчыны ёсць шмат падзей, цікавасць да якіх заўсёды захоўваецца. Адной з іх з`яўляецца вайна 1812 г. Гэта падзея, аб значэнні якой магчыма меркаваць не ў апошнюю чаргу, дзякуючы шматлікім мемуарам. Да ліку найбольш вядомых адносяцца мемуары ад`ютанта Напалеона генерала графа Сегюра. Вось ужо больш за 180 гадоў ніводнае з даследаванняў па гэтаму перыяду не абыходзіцца без спасылак на весткі, якія паведамляюцца ім.

У мемуарах Сегюра ўзгадваецца цікавы эпізод, звязаны са спаленнем у мястэчку Бобр па загаду Напалеона сцягоў усіх карпусоў французскай арміі.[2] У рускай гістарычнай літаратуры ён упершыню быў прыведзены гісторыкам В.І. Міхайлоўскім-Данілеўскім .[3] Ягоная праца атрымала станоўчую ацэнку імператара Нікалая І, і гэта дало ўсім весткам, што паведамляюцца ў ёй, асобую дакладнасць. З таго часу ў грамадскай свядомасці эпізод са знішчэннем французскіх сцягоў стаў фактам, які не

[1] Стэфан (Мустафа) Беляк меў, відаць, іншае прозвішча. Гэта прозвішча даў яму кароль. Беляк быў вельмі смуглы. Кароль сказаў: "Які ж ты ў мяне беленькі, беляк". Гэтая мянушка і замацавалася за храбрым воінам. Чорненькі — стаў беленькі (папольску — беляк).

[2] Поход на Москву в 1812 году. Мемуары участника, французского генерала графа де Сегюра. Москва 1911.С.175.

[3] *Михайловский-Данилевский В.И.* Описание Отечественной войны 1812 г. СПб., 1840. Ч. 4. С.135.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

патрабаваў доказаў, набыў статус хрэстаматыйнага прыкладу безнадзейнага становішча Вялікай арміі яшчэ да пераправы яе цераз р. Бярэзіну ў лістападзе 1812 г. Ды і сама бітва на пераправе пасля гэтага стала лічыцца як безумоўная перамога расійскіх войскаў над знясіленымі, дэмаралізаванымі французамі.

Сапраўды, пасля адыходу з Масквы сітуацыя складвалася не на карысць французаў. Асабліва яна пагоршылася, калі Напалеон даведаўся, што войскі адмірала Чычагава захапілі Барысаў, авалодалі пераправай цераз Бярэзіну і тым самым перарэзалі шлях адыходу Вялікай арміі. Вось тады Напалеон, па версіі Сегюра і аддаў загад аб знішчэнні ўсіх сцягоў карпусоў. Пайсці на такія надзвычайныя меры Напалеон мог толькі перад тварам немінучай капітуляцыі, але, на самой справе, гаворка аб гэтым не ішла!

Французскія войскі, якія адступалі з Масквы, апынуліся на тэрыторыі Беларусі ў цяжкім, але не ў безнадзейным становішчы. Удзельнікі паходу потым успаміналі, што на прасторы ад Дняпра да Бярэзіны армія адчувала сябе лепш, чым у Маскоўскай і Смаленскай губернях.[1] Харчовыя прыпасы папаўняліся з падрыхтаваных загадзя ў Дуброўне, Оршы, Талачыне, Маладзечне і Ашмянах правіянцкіх складаў. Мясцовае насельніцтва, пераважна шляхта, адносілася да французаў дастаткова лаяльна, лічачы Напалеона гарантам адраджэння незалежнасці Рэчы Паспалітай. Акрамя таго, у Беларусі да рэшткаў Вялікай арміі далучыліся баяздольныя карпусы маршалаў Удзіно і Віктора, якія дагэтуль дзейнічалі на паўночным напрамку. Такім чынам, французская армія ўяўляла з сябе яшчэ грозную моц і Напалеону не патрэбна было паліць сцягі, бо ён не збіраўся капітуляваць і разлічваў з боем прарвацца праз заслону.

Не пацвярджаюць версію Сегюра і ўспаміны іншых удзельнікаў пахода на Маскву. Яны сведчаць, што па меры пагаршэння становішча, камандзіры воінскіх часцей самастойна прымалі меры па захаванню сцягоў. Вядома, што вюртэмбергскі корпус не страціў у час адыходу ніводнага сцяга таму, што ягоны камандзір яшчэ на выхадзе з Вязьмы загадаў зняць сцягі з дрэўкаў і перадаць на захаванне найбольш моцным салдатам. Яны абвязвалі сцягі вакол цела, а ўрачы павінны былі сачыць за імі і аказваць дапамогу ў час баёў у першую чаргу. Да такога ж спосабу захавання сцягоў звярталіся і ў іншых вайсковых адзінках. Напрыклад, сцяг 44-га пяхотнага палка быў знойдзены ў лістападзе 1812 г. у Мінскай губерніі на трупе французскага салдата.[2]

Па меры адступлення французскай арміі многія палкі не маглі

---

[1] *Липранди И.П.* Некоторые замечания, подчеркнутые преимущественно из иностранных источников, о действительных причинах гибели наполеоновских полчищ в 1812 г. СПб., 1855. С. 96.

[2] ЦГАОР ф. 1165. ОП. 1. Д. 134. Л. 45.



забяспечыць надзейную ахову сцягоў. У сувязі з гэтым Напалеон загадаў у Оршы ўскласці адказнасць за іх захаванасць на камандзіраў палкоў.[1] Як бачна, гаворка ішла аб захаванні, а не аб знішчэнні сцягоў. Найбольш баяздольныя войскі працягвалі адступленне пад сваімі сцягамі. Сяляне вёскі Студзёнка, дзе адбывалася славутая пераправа, успаміналі, што для будаўніцтва мастоў сапёры разабралі ўсе хаты, акрамя адной, дзе грэўся імператар, а таксама "гвардейские знаменщики, или орлохранители, так как и сами орлы[2] были снесены в эту избу".[3]

Такім чынам, сцверджанне Сегюра аб знішчэнні ў мястэчку Бобр сцягоў усіх карпусоў французскай арміі не пацверджваюцца дадзенымі іншых першакрыніц. Але можна меркаваць, што мела месца знішчэнне сцягоў асобных воінскіх часцей, якія скончылі да таго часу сваё існаванне. Добра вядома, што пры адступленні з Масквы найвялікшыя страты панесла кавалерыя. Коні гінулі ад бяскорміцы, ламалі ногі на абледзянелых дарогах. У гэтай сувязі ўяўляе пэўную цікавасць успамін удзельніка кампаніі 1812 г., прадстаўніка Вялікабрытаніі пры штабе расійскай арміі Роберта Вільсана. Казакі, якія яго суправаджалі, пасля першых маразоў знайшлі загінуўшых коней французскага абозу. Яны абследавалі іх, а потым пачалі скакаць ад радасці, указваючы на конскія падковы: "Божьей волей Наполеон забыл, что у нас бывает зима. Вражьи кости останутся в России".[4]

Казакі мелі рацыю ў сваіх меркаваннях. Адсутнасць зімовых падкоў пагібельным чынам адбілася на стане ўсіх часцей французскай арміі, дзе выкарыстоўваліся коні. Палонны баварскі генерал Прэйсінген сцвярджаў, што ён змог дастаць зімовыя падковы для свайго каня толькі ў Смаленску, заплаціўшы конюху імператара тры луідоры.[5]

Што тады гаварыць аб радавых кавалерыстах? Сам Напалеон пасля бітвы пад Красным прызнаў, што "строевые лошади валятся тысячами. В несколько дней их погибло более 30 тысяч, большая часть нашей конницы спешилась...".[6] Такім чынам, ужо на падыходзе да Беларусі французская кавалерыя скончыла сваё існаванне як род войскаў. У Оршы

---

[1] *Харкевич В.Н.* Березина в 1812 году. СПб., 1898. С. 51.

[2] Арол — здаўна прызнаваўся сімвалам сілы і ўлады. Ужо Дарый выкарыстоўваў адлюстраванне залатога арла на вяршыні персідскіх сцягоў... У сярэднія вякі арлы не ставіліся на вяршыні сцягоў і зноў з'явіліся толькі ў 1804 г. у войсках Напалеона. Самі сцягі ўбраныя арламі атрымалі назву "арлоў".

[3] *Игнатьев Р.Г.* Деревня Студёнка, место переправы Наполеона I через р. Березину // Минские губернские ведомости. 1877. № 33.

[4] *Роберт Вильсон* очевидец компании 1812 г. // Военный сборник. 1860. № 12. С. 326.

[5] 29 бюллетень французской армии с замечаниями к нему одного русского офицера // Вестник Европы. 1813. Ч. 68. С. 285.

[6] Там жа. С. 287.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Напалеон загадаў узмацніць безлашаднымі кавалерыстамі пяхотныя часці. З застаўшыхся коней ледзь удалося сфарміраваць "свяшчэнны эскадрон" для аховы імператара. Ён складаўся з 500 чалавек і палкоўнікі ў ім служылі ў якасці радавых, а генералы камандавалі падраздзяленнямі.[1] Сцягі расфарміраваных кавалерыйскіх часцей перадаваліся ў абоз, пад ахову гвардыі.

Падрыхтоўка да прарыву за Бярэзіну патрабавала ўзмацнення мабільнасці авангарду, якая стрымлівалася вялікім абозам. Менавіта ў Бабры Напалеон аддаў загад аб скарачэнні абозаў. Кавалерыйскія часці к таму часу ўжо былі расфарміраваны, іх сцягі ўяўлялі з сябе не больш чым гістарычную рэліквію і таму маглі быць спалены з іншымі рэчамі з абозаў. Афіцыйных дакументаў аб гэтым не захавалася, да і наўрад ці яны былі наогул, улічваючы цяжкасць становішча і неабходнасць аператыўнага прыняцця самых радыкальных мер. Ускосным пацвярджэннем можна лічыць толькі лаканічнае прызнанне аднаго з удзельнікаў адступлення: "Император прибыл в Бобр. Орлы кавалерийских частей сожжены, мы уверены, что таким образом у нас их не отнимут".[2]

З улікам усіх вышэйназваных абставін магчыма зрабіць выснову аб тым, што Сегюр у сваіх успамінах памыліўся, сцвярджаючы аб спаленні ў Бабры ўсіх сцягоў французскай арміі. Размова магла ісці толькі аб знішчэнні сцягоў расфарміраваных кавалерыйскіх часцей.

Калі гэта дапушчэнне правільна, то палажэнне аб безнадзейнасці французскіх войскаў яшчэ да пераправы цераз Бярэзіну ў лістападзе 1812 г., якое замацавалася ў афіцыйнай гістарыяграфіі, уяўляецца памылковым. Гэтым у сваю чаргу выклікаецца неабходнасць перагляду сцвярджэння аб разгроме рэшткаў Вялікай арміі пры пераправе і поўнай перамозе расійскіх войскаў у гэтай бітве. Французскія войскі ўяўлялі з сябе яшчэ грозную сілу і трохдзённая бітва на Бярэзіне лепшае таму пацвярджэнне.

Галоўнай мэтай Напалеона было ажыццявіць пераправу і прарвацца з баяздольнымі войскамі праз рускія заслоны, каб працягнуць адыход у напрамку на Вільна. Асноўная задача рускага камандавання была адваротная — не дапусціць выхаду французскіх войскаў з акружэння і цалкам знішчыць іх на берагах Бярэзіны.

Першапачаткова больш спрыяльныя ўмовы былі на баку рускіх войскаў. Атрады Дунайскай арміі адмірала Чычагава захапілі масты праз Бярэзіну ў Барысаве і такім чынам адрэзалі адыход Вялікай арміі. На дапамогу Чычагаву з поўначы падышлі войскі генерала Віттенштэйна. З тылу войскі Напалеона праследаваў з галоўнымі сіламі расійскай арміі Кутузаў, а шлях на поўдзень быў закрыты вайскамі генерала Ажэроўскага.

Але Напалеон не згубіўся ў гэтых цяжкіх абставінах. Зразумеўшы,

[1] *Ниве П.А.* Отечественная война. СПб., 1911. Т. 5. С. 647.

[2] Французы в России.1812 год по воспоминаниям современников-иностранцев. Москва 1912. Ч.3. С. 140.



што пераправіцца цераз Бярэзіну ў Барысаве немагчыма, ён аддаў загад шукаць бродаў цераз раку. Адзін з іх быў знойдзены ў 14 кіламетрах вышэй Барысава, каля вёскі Студзёнка. Каб ашукаць камандуючага расійскімі войскамі адмірала Чычагава, адзін батальён французскіх сапёраў быў пасланы Напалеонам да вёскі Ўхалода, дзе таксама меўся брод. Разам з сапёрамі да гэтага месца пацягнулася і вялікая колькасць дэмаралізаваных салдат, якія ўжо даўна пакінулі свае падраздзяленні. Увялі Чычагава ў зман і звесткі, якія ён атрымаў ад барысаўскіх гараджан. Напярэдадні з імі меў размову камандуючы французскімі войскамі ў Барысаве маршал Удзіно. Ён выпытваў у гараджан, ці можна пераправіцца цераз Бярэзіну каля Ухалод і пад пагрозай смерці забараніў каму-небудзь паведаміць аб адбыўшайся размове. Але барысаўчане былі патрыётамі і ў тую ж ноч перабеглі да рускіх, дзе паведамілі Чычагаву аб планах Удзіно. Менавіта на гэтым і будаваў свае намеры французскі маршал па зману Чычагава. Той сапраўды вырашыў, што галоўныя сілы напалеонаўскіх войск будуць рабіць пераправу ніжэй Барысава і аддаў загад сваім атрадам рушыць да Ухалод. Вымушаны падпарадкавацца гэтаму загаду быў і генерал Чапліц, які са сваім палком ахоўваў брод каля Студзёнкі. Ягоны адыход адбыўся як раз у той момант, калі французскія сапёры пачалі падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва мастоў...

У выніку Напалеон выйграў першы этап бітвы на Бярэзіне, не зрабіўшы ніводнага стрэлу. І гэта тады, калі нават ягоныя бліжэйшыя паплечнікі ўжо страцілі ўсялякую надзею на выратаванне. Маршал Ней грамкагалосна заявіў, што: "... наша становішча безнадзейна і калі Напалеон знойдзе з яго выйсце, то ў ім сядзіць сам чорт!".[1] Не больш аптымізму было і ў заяве маршала Мюрата: "... мы ўсе загінем, аб здачы ў палон не можа быць гаворкі!".[2]

Раніцаю 26 лістапада Напалеон аддаў загад будаваць два масты праз Бярэзіну. Першы з іх прызначаўся для пераправы артылерыі і абозаў, а другі — для пяхоты. Яны былі пабудаваны на працягу дня і адразу ж па іх пачалі перапраўляцца баяздольныя войскі і артылерыя. Нешматлікія рускія дазоры не змаглі перашкодзіць пераправе і былі прымушаны адысці да Барысава. Толькі ад іх Чычагаў даведаўся аб тым, што яго ашукалі. Ён аддаў загад сваім войскам рушыцца да Студзёнкі, але час быў ужо страчаны. На працягу 26 і 27 лістапада французскія войскі ажыццяўлялі пераправу без перашкод і займалі зручныя пазіцыі на абодвух берагах ракі, каб мець магчымасць абараняць падыходы да яе, пакуль не пераправяцца ўсе вайсковыя падраздзяленні і абозы.

Адзіны поспех, якога дамагаліся расійскія войскі 27 лістапада, — гэта разгром і ўзяцце ў палон французскай дывізіі генерала Партуно, якая

[1] Поход на Москву. в 1812 году. Мемуары участника, французского генерала графа де Сегюра. Москва 1911. С. 180.

[2] Там жа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

знаходзілася ў ар`ергардзе пры адыходзе з Барысава. Шляхі адступлення ёй перарэзалі войскі корпуса Вітгенштэйна, якія дзейнічалі на левым беразе Бярэзіны. Пасля кароткачасовага бою Партуно прымушаны быў здацца. Цікава, што ягоная дывізія была з ліку тых нямногіх часцей, якія фарміраваліся выключна з французаў.

З ранку 28 лістапада перадавы атрад корпуса Вітгенштэйна пад камандаваннем генерала Уластава атакаваў пазіцыі французскіх войскаў маршала Віктора, якія ахоўвалі падыходы да пераправы на левам беразе. Уся бітва разгарнулася на схілах пагоркаў, паміж якімі працякаў невялікі ручай. Цераз яго праходзіў шлях з Барысава ў Студзёнку. Французскія войскі займалі пазіцыі з правага боку ручая. Правым флангам яны ўпіраліся ў Бярэзіну, а левы быў непрыкрыты. Спроба Уластава з ходу атакаваць французаў не ўдалася і рускія войскі прымушаны былі адысці. Дачакаўшыся падмацаванняў, Уластаў зноў аддаў загад атакаваць. Асноўны ўдар быў накіраваны супраць непрыкрытага левага фланга войск Віктора. Каб скрыць свой намер, Уластаў выдвінуў наперад батарэю гармат, якія пачалі абстрэл пераправы. Пасля першых залпаў там пачалася паніка. Віктор быў прымушаны кінуць у бой усе свае рэзервы, у тым ліку і частку войск з левага фланга. Гэтага якраз і чакаў Уластаў. Паводле яго загаду на левы фланг пачалі наступленне Магілёўскі пяхотны і Зводны кірасірскі палкі. Атака была паспяховай. Расійскія войскі замацаваліся на правым баку ручая і пачалі пагражаць французам з фланга і тылу. Віктор быў прымушаны адысці да самой пераправы, але сцямнела, і рускія атрады не сталі праследаваць ворага. Гэта нерашучасць дала магчымасць войскам Віктора замацавацца на новых пазіцыях. Такім чынам, нягледзячы на двайную перавагу ў сілах[1], Вітгенштэйн не здолеў дасягнуць поспеху і перашкодзіць пераправе.

У гэты дзень, 28 лістапада, на правым беразе Бярэзіны адбыўся яшчэ адзін бой. У ім з расійскага боку ўдзельнічала 15 тысяч чалавек, а з французскага — 10 тысяч.[2]

Ужо з ранку авангард расійскіх войскаў пад камандаваннем генерала Чапліца пачаў атаку супраць французскіх пазіцый. Але яна поспеху не мела. Прычынай таму была колькасная перавага французскай артылерыі, якая займала пануючыя ўзгоркі. На дапамогу Чапліцу адмірал Чычагаў паслаў дзве пяхотныя дывізіі пад камандаваннем генерала Сабанеева. Той загадаў сваім войскам рушыць праз густы лес не калонамі, а па аднаму. Няведаючы мясцовасці, многія салдаты заблыталіся і выйшлі не туды, куды было патрэбна.

Якраз у эты момант маршал Удзіно загадаў апошняй захаваўшай баяздольнасць кавалерыйскай часці — кірасірскай дывізіі генерала

[1] Расійскія войскі налічвалі 15 тысяч , а французскія — ад 7 да 10 тысяч.

[2] *Ниве П.А.* Отечественная война. СПб., 1911. Т. 5. С. 748.



Думерка правесці атаку. Імклівая атака кірасіраў супраць разагнаных артылерыйскім агнём войск Чапліца і рассыпаных па лесе дывізій Сабанеева аказалася вельмі паспяховай. У выніку расійскія войскі страцілі больш 2-х тыс. чалавек, у тым ліку палоннымі каля 600 чалавек.[1] Страты французаў, мусіць, былі не меншыя, але дакладных даных няма, таму што ў тых цяжкіх умовах ніякага падліку не рабілася. Аб жорсткасці бітвы сведчыць той факт, што гвардыя Напалеона страціла трэць свайго саставу, а малодшая — больш чым палову.

З надыходам цемнаты бой заціх, расійскія і французскія войскі засталіся на тых пазіцыях, якія яны займалі да яго пачатку. Такім чынам, спроба Чычагава перашкодзіць пераправе рэшткам Вялікай арміі скончылася няўдачай.

У гістарычнай літаратуры, прысвечанай падзеям на Бярэзіне, пастаянна ідзе гаворка аб бітве паміж расійскімі і французскімі войскамі. Але гэта не зусім дакладна. Справа ў тым, што к таму часу большую частку Вялікай арміі складалі ўжо не чыста французскія войскі. Пад камандаваннем маршала Віктора ў бітве на левым беразе знаходзіліся польскія і нямецкія пяхотныя дывізіі, нямецкая кавалерыя і толькі 300 французаў. З чатырох дывізій, якія прынялі ўдзел у бітве на правым беразе, дзве былі французскімі, адна польскай і адна швейцарскай.[2] Падлікі, якія зрабіў польскі гісторык Білецкі, сведчаць, што ў гэтых баях найбольшы ўдзел прынялі польскія войскі. На левым беразе яны складалі 30%, а на правым — 57% ад агульнай колькасці напалеонаўскіх войскаў, што прынялі ўдзел у баях.[3]

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што падзеі на Бярэзіне не з`яўляліся знішчэннем дэмаралізаваных войск праціўніка. Гэта была бітва роўных па сіле войскаў, у якой кожны з бакоў меў канкрэтную мэту. Паколькі Напалеон змог ажыццявіць пераправу і вырвацца са стратэгічнага акружэння, то правамерна лічыць, што ён выйграў бітву. Аднак дасталася яна французам дарагой цаной. На берагах Бярэзіны вялікія страты панеслі апошнія баяздольныя часткі французскай арміі — карпусы Удзіно і Віктора, старая і малодшая гвардыі. Загінулі або трапілі ў палон каля 30 тысяч небаяздольных салдат і асоб грамадзянскага насельніцтва, якія суправаджалі армію да Масквы. Менавіта пасля бітвы на Бярэзіне Вялікая армія канчаткова страціла сваю баяздольнасць і скончыла існаванне як рэгулярнае войска.

[1] Там жа. С. 740-741.

[2] Там жа. С. 750.

[3] *R. Bielecki.* Berezyna 1812 Warszawa 1990. S.215.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ